имиджа библиотеки / Е. Сипакова // Што мы ведаем аб гэтай вайне? / склад. Л.І. Макаранка, В.А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2014. – С. 36. – (Бібліятэка прапануе).
5. Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска [Электронный ресурс] / ГУ «Централизованная система детских библиотек г. Минска». – Режим доступа: http://www.childlib.by. – Дата доступа : 10.06.2015.

# БІБЛІЯТЭКА-МУЗЕЙ ЯК АГУЛЬНАДАСТУПНЫ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР РЭГІЁНА: ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ І ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЗЕЙНАСЦІ

**Пераверзева Ю. А.**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык аддзела камплектавання фондаў ДУ "Нацыянальная бібліятэка Беларусі" (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная бібліятэка з'яўляецца важнейшым сацыяльна-культурным цэнтрам грамадства, які выконвае інстытуцыянальныя функцыі, накіраваныя на зберажэнне духоўнай, гістарычнай і літаратурнай спадчыны, аднаўленне і трансляцыю культурна-асветніцкіх традыцый, стварэнне бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і аказанне паслуг, змест якіх прадугледжвае ўсебаковае развіццё асобы карыстальніка. Іншымі словамі, падзяляючы думку вядомага расійскага бібліятэказнаўцы С.А. Басава, можна зазначыць, што сёння бібліятэка "павінна быць інфармацыйным люстэркам жыцця мясцовай грамадскасці і інстытутам сацыялізацыі (сацыяльна-культурнай, грамадзянскай, інтэлектуальнай)" [1, с.10].

Да гэтай высновы, па сутнасці, прыйшоў у свой час рускі мысляр М.Ф. Фёдараў, які быў супраць аддзялення бібліятэкі ад музея. Ён лічыў, што яны павінны складаць адно цэлае па духу і па змесце. Вучоны пісаў аб вялікім значэнні бібліятэк і музеяў як ачагоў духоўнай спадчыны, цэнтраў збірання, даследавання і асветніцтва, маральнага выхавання: "У бібліятэках адбываюцца зносіны з вялікімі продкамі, і яны павінны стаць цэнтрам грамадскага жыцця, аналагам храмаў, месцам, дзе людзі далучаюцца да культуры і навукі" [Цыт. па: 3] і распрацаваў канцэпцыю музейна-бібліятэчнай адукацыі.

Але на сённяшні момант у бібліятэчнай справе краіны склалася даволі складаная сітуацыя, абумоўленая, па-першае, адмоўнай дынамікай сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў асабліва ў сельскай мясцовасці, і па-другое, – недахопам у бібліятэк уласных рэсурсаў (кадравых, фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных і інш.) для эфектыўнага функцыянавання. Каб знайсці выйсце з гэтай сітуацыі і захаваць дасягнуты ўзровень бібліятэчнага абслугоўвання, органамі ўлады было прынята рашэнне аб стварэнні на базе нерэнтабельных публічных бібліятэк інтэграваных бібліятэчных устаноў, у тым ліку бібліятэк-музеяў.

Першыя бібліятэкі-музеі пачалі дзейнічаць у пачатку 2000-х гг. у асноўным у сельскай мясцовасці. Іх адкрыццё было цесна звязана з уздымам бібліятэчнага краязнаўства, калі "разам з кнігай фарміраванне і раскрыццё прадметна-ілюстрацыйнага раду становіцца адным з галоўных, афіцыйна заяўленых аўтарытэтаў – мяняецца статус бібліятэкі, яна прымае на сябе

даследчыя функцыі” [2, с.21] і такім чынам атрымлівае новую назву.

Бібліятэка-музей, на думку С.Р. Матлінай, гэта “полістылістычная, інтэгратыўная форма духоўнага ўзнаўлення. Пастаянныя экспазіцыі ў комплексе з дакументнымі бібліятэчнымі рэсурсамі дазваляюць наглядна, прадметна перайсці ад традыцыйных асноў бібліятэчнага краязнаўства – інфармавання – да стварэння сістэмных ведаў, на якіх фарміруюцца новыя каштоўнасныя ўяўленні аб сваім краі” [5, с.15].

Большасць адкрытых у гэты перыяд бібліятэк-музеяў мела літаратурны профіль. Сярод іх Каменская бібліятэка-музей імя Тодара Кляшторнага (2003 г., Лепельская РЦБС) паспяхова папулярызуе творчую спадчыну паэта-земляка, займаецца асветніцкай дзейнасцю па далучэнні моладзі і падлеткаў да вывучэння літаратурнай спадчыны, Нізаўская бібліятэка-музей Уздзенскай ЦБС (2004 г.). На працягу 2005 г. на базе сельскіх бібліятэк арганізавана 3 бібліятэкі-музеі. Найбольш вядомымі з’яўляюцца бібліятэка-музей імя Я. Купалы – былая Вялікакракоцкая сельская бібліятэка Слонімскай ЦБС, Агародня-Гомельская сельская бібліятэка Добрушскай РЦБС. Усяго за перыяд 2001–2005 гг. утворана каля 10 сельскіх бібліятэк-музеяў [8].

Разам з тым, колькасць бібліятэчных устаноў, якія займаюцца музейнай дзейнасцю, адсачыць даволі складана. Звесткі пра колькасныя паказчыкі работы публічных бібліятэк, якія збіраюцца ў інтэграваным банку дадзеных устаноў культуры, не ўтрымліваюць дакладную інфармацыю, якая датычыцца бібліятэк-музеяў. Так, у вышэйназваным банку дадзеных на канец 2012 года прадстаўлены звесткі аб бібліятэках-музеях Брэсцкай і Мінскай абласцей (адзначана 9 устаноў: 6 у Брэсцкай вобласці і 3 у Мінскай). Пры гэтым колькасныя паказчыкі, якія адносяцца да бібліятэк-музеяў іншых рэгіёнаў, за гэты перыяд не адлюстраваны. Іх можна атрымаць з апублікаваных крыніц [7] і вылучыць штогадовую тэндэнцыю да павелічэння: напрыклад у Магілёўскай вобласці ў 2012 годзе колькасць бібліятэк-музеяў узрасла на дзве адзінкі (з 8 у 2011 г. да 10 у 2012 г.).

Такім чынам, згодна са статыстычнымі дадзенымі за 2006–2010 гг., у бібліятэку-музей рэарганізавана 21 сельская бібліятэка [9], што на 11 устаноў больш у параўнанні з мінулым пяцігадовым перыядам.

Дарэчы, у Расіі каля 20% публічных і навуковых бібліятэк займаюцца музейнай дзейнасцю, але яна адпаведна расійскаму заканадаўству не з’яўляецца статутнай. Адсюль узнікае праблема легітымнасці мемарыяльных фондаў і бібліятэк-музеяў у гэтай краіне, што стала прадметам для абмеркавання на Усерасійскай канферэнцыі “Музейная дзейнасць публічных бібліятэк” [3]. У Беларусі такая праблема не настолькі актуальна, бо бібліятэкі-музеі працуюць згодна са спецыяльна распрацаванымі палажэннямі (напрыклад, Палажэнне аб дзейнасці бібліятэкі – грамадскага музея народнай творчасці і побыту вёскі Леванова (Барысаўскі раён)) і іх функцыянаванне рэгулюецца заснавальнікамі ў рамках дзеючага заканадаўства.

Музейныя экспазіцыі публічных бібліятэк у большасці грунтуюцца на экспанаванні кніг і рознага кшталту пісьмовых і друкаваных крыніц. Аб’ектамі музеефікацыі таксама з’яўляюцца іншыя дакументы з аўтографамі, экслібрысы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзённікі, навуковыя працы, паштоўкі, асабістыя рэчы пісьменнікаў, прадметы побыту, дэкаратыўна-прыкладныя вырабы і г.д.

Абагульненне вопыту работы бібліятэк-музеяў сведчыць аб тым, што:

– яны пачаліся з куткоў народнага побыту і выстаў, дзе разам з кнігамі на экспазіцыі прысутнічалі рэчыўныя аб’екты;

– іх змястоўная, арганізацыйна-тэхналагічная дзейнасць часцей за ўсё будуецца з улікам менталітэту мясцовага насельніцтва, што вызначае не толькі профіль музейнай экспазіцыі, але і формы зносінаў паміж суб’ектамі музейна-інфармацыйнага асяроддзя, віды патрэбнасцяў наведвальнікаў (карыстальнікаў), ступень уздзеяння на культурную прастору той ці іншай тэрыторыі;

– узнікненне рэчыўных матэрыялаў і іх структурыраванне адбываецца на энтузіязме бібліятэкараў, мясцовых жыхароў і краязнаўцаў, перадачы грамадзянамі ў бібліятэку прыватных калекцый рэдкіх і каштоўных выданняў;

– супрацоўнікі бібліятэк-музеяў выконваюць пошукава-даследчыя функцыі, што праяўляецца ў стварэнні летапісаў населеных пунктаў, хронік значных падзей, генеалагічных дрэваў;

– у навуковую канцэпцыю экспазіцыі ўключаецца праца з дакументамі і адбор прадметаў, якія адпавядаюць зместу дакумента, характарызуюць яго персанажаў, іх быт, гістарычныя, грамадскія і іншыя ўмовы жыццядзейнасці;

– культурна-адукацыйная дзейнасць рэалізуецца праз правядзенне экскурсій, прэзентацый, літаратурных чытанняў, флэш-мобаў, што сведчыць аб уключэнні суб’ектаў музейнай дзейнасці ў працэс творчага самаразвіцця;

– у асноўным бібліятэчна-музейныя экспазіцыі з’яўляюцца мемарыяльнымі, гісторыка-краязнаўчымі (этнаграфічнымі), літаратурнымі, экалагічнымі;

– літаратурныя музейныя экспазіцыі часцей прысвечаны асобным пісьменнікам, кнігам, дакументам пэўнага жанру;

– бібліятэкі-музеі дзейнічаюць у рамках абласных праграм (“Трацыйная культура і дзеці” на 2006–2010 гг., Мінская вобласць) і праектаў (“Барысаўскі край – наша слава і гонар”);

– у структуру інтэграванай установы ўваходзяць хатні абанемент і непасрэдна музей, а яе даведачна-бібліяграфічны апарат прадстаўлены алфавітным і сістэматычным каталогамі, краязнаўчай картатэкай і сістэматычнай картатэкай артыкулаў.

Аналіз спецыяльнай літаратуры [2; 4; 6] і работы бібліятэк-музеяў паказаў, што на сённяшні момант існуе шэраг аб’ектыўна-суб’ектыўных прычын, якія не дазваляюць пашыраць напрамкі музейнай дзейнасці ў публічных бібліятэках:

– будынкі бібліятэк не прыстасаваны для экспанавання музейных прадметаў і захавання адпаведных фондаў;

– адсутнасць спецыяльнага музейнага абсталявання і немагчымасць падтрымання ў памяшканнях неабходных параметраў вільготнасці, асвятлення, ацяплення;

– музейныя экспазіцыі і выставы рыхтуюцца бібліятэкарамі без



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўнага ўдзелу ў гэтым працэсе прафесіянальных мастакоў, дызайнераў, што выклікае адсутнасць комплекснай канцэпцыі бібліятэкі-музея;

– няма адзінага дакумента, які б рэгламентаваў і ўтрымліваў звесткі аб правамоцнасці ўключэння ў фонды бібліятэк-музеяў пэўных крыніц і матэрыяльных носьбітаў;

– прафесійная негатоўнасць бібліятэкараў да падрыхтоўкі і вядзення ўліковай і справаздачнай дакументацыі, якая адносіцца да музейных калекцый, музейна-педагагічных праграм, экскурсійнай дзейнасці;

– недахоп часу для вывучэння бібліятэкі як аб'екта культурнага, гісторыка-архітэктурнага набытку горада, вёскі.

З улікам сацыяльна-дэмаграфічнага становішча рэгіёна, матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі, дзе функцыянуе музей, наяўнасці супрацоўнікаў, здольных выконваць абавязкі як інфармацыйна-бібліятэчнага, так і музейнага зместу, можна спрагназаваць, што мадэль бібліятэкі – бібліятэка-музей – перспектыўная форма інавацыйнага сацыякультурнага абслугоўвання насельніцтва, у якой спалучаюцца інтэлектуальныя, культурна-асветніцкія, выхаваўчыя, інфармацыйныя рысы медыякомплекса. Гэта значыць, што пры наяўнасці розных параметраў працоўных плошчаў і фондаў, мультымедыйных сродкаў у бібліятэках-музеях павінны быць устаноўлены адпаведныя крытэрыі і паказчыкі, якія датычацца колькасці і якасці аказваемых паслуг, колькасці наведвальнікаў і інш. Важным застаецца пытанне аб прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў для бібліятэк-музеяў: што яны патрабуюць ад сферы профільнай адукацыі і ад работадаўцаў?

Развіццё музейнай дзейнасці ў публічных бібліятэках, на наш погляд, будзе аптымальным і будзе адпавядаць культурным патрабаванням наведвальнікаў, калі дакладна будзе вызначана роля, месца, сутнасныя палажэнні, прававы статус бібліятэк-музеяў у сучаснай сацыякультурнай прасторы; калі ўзаемапранікненне музейных форм у бібліятэчную дзейнасць будзе ўспрымацца ўладамі і грамадскасцю як фактар, неабходны для фарміравання культурнага пласта тэрыторыі (раёна абслугоўвання); калі ў краіне будзе распрацавана канцэпцыя дзейнасці бібліятэк-музеяў.

З'яўленне бібліятэк-музеяў стала адметнай з'явай у культурным жыцці тэрыторый. Яны запатрабаваны грамадствам, бо зберагаюць гісторыю мясцовай супольнасці і яе традыцыі; выяўляюць новыя якасныя змены ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання, асабліва ў камунікатыўным плане; ствараюць унікальны стыль інфармацыйнай дзейнасці, які суправаджаецца даследчымі вынаходніцтвамі ў літаратуразнаўчым, гістарычным, філасофскім кантэкстах у адносінах да рэдкіх і каштоўных выданняў.

1. Басов, С.А. «…Но гражданином быть обязан» : публичная библиотека как социальный модератор / С.А. Басов // Библ. дело. – 2007. – № 6. – С. 9–12.

2. Капыток, А. "У сваім краі як у раі". Бібліятэка-музей у сацыякультурнай прасторы рэгёна: быць або не быць? / А. Капыток // Бібл. свет. – 2010. – № 3. – С. 21 – 24.

3. Кузнецова, Т.В. Музейная деятельность библиотек: культурная инициатива или социальная закономерность (на примере общедоступных библиотек Санкт-Петербурга) [Электронный ресурс] / Т.В. Кузнецова. – Режим доступа:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://www.pandia.ru/text/77/238/43737.php. – Дата доступа: 20.10.2013.
4. Курбака, Н. Бібліятэкі-музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці / Н. Курбака // Бібл. свет. – 2012. – № 1. – С. 17 – 18.
5. Матлина, С. Путь вперёд – через возвращение к истокам / С. Матлина // Хроники краеведа. – 2006. – № 1. – С. 12 – 17.
6. Музеи краеведческой направленности в библиотеках как фактор приобщения к культурному достоянию народа: метод. рекомендации / Нац. б-ка им. А.С.Пушкина Респ. Мордовия; [сост. Л.А. Рассохина; ред.: Л.Г. Меркушкина, С.А. Грибова, С.Н. Архипова]. – Саранск, 2006. – 24 с. (Библиотечная панорама; вып. 18).
7. Пашковская, Т.Г. Сеть библиотек. Цифровые показатели / Т.Г. Пашковская // Публичные библиотеки Могилёвщины в 2012 году : обзор деятельности. Статистические показатели работы / УК «Могилёвская областная библиотеки им. В.И. Ленина», Отдел маркетинга и библиотековедческой работы ; [сост.: О.А. Чумакова и др. ; отв. за выпуск И.В. Сорокина]. – Могилёв: Могилёвская областная библиотека им. В.И. Ленина, 2013. – С. 14.
8. Рынкевіч, В.А. Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва / В.А. Рынкевіч // Публічныя бібліятэкі на пачатку XXI стагоддзя [Электронны рэсурс] : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. В.А. Рынкевіч ; рэд. М.Г. Алейнік. А.Я. Іванова. – Электрон. дадзен. і прагр. (64 МБ). – Мінск, 2008. – 1 электрон. апт. дыск (CD ROM).
9. Рынкевіч, В.А. Сетка публічных бібліятэк: асноўныя паказчыкі дзейнасці і тэндэнцыі развіцця / В.А. Рынкевіч // Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2006–2010) [Электронны рэсурс] : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; рэд. Т.А. Ероха, Л.Г. Кірухіна, М.Г. Пшыбытка, В.А. Сабалеўская ; адказ. за вып. В.А. Рынкевіч. – Электрон. тэкст. дан. і прагр. (9,7 МБ). – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2012. – 1 электрон. апт. дыск (CD ROM).

# РОЛЬ МИНИАТЮРНОЙ КНИГИ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

**Ротько Т. В.**
*магистр искусств, аспирант, заместитель начальника НИО*
*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*
*(Республика Беларусь, г. Минск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На протяжении последних десятилетий в художественном творчестве все большее распространение получает книжная миниатюризация, в которой книга рассматривается как художественный артефакт, компактный предмет искусства, сочетающий в себе эстетическое и интеллектуальное начала.

Раскрытие специфики миниатюрной книги[36] как произведения искусства невозможно без выявления особенностей ее бытования в социокультурном пространстве на различных этапах исторического развития.

На наш взгляд, в обозначенном контексте важным этапом миниатюрного книгоиздания является период Великой Отечественной войны. В военные годы на миниатюрные книги была возложена особая миссия – укреплять и поднимать боевой дух воинов (посредством издания в миниатюрном формате очерков, памфлетов, антифашистских карикатур и других произведений), информировать о положении дел на фронтах, доводить до сведения

[36] Миниатюрная книга – это книга, формат которой не превышает 100х100 мм